УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ЛАКШТАНАЎ ІОСІФ ПЯТРОВІЧ

**АКЦЁР, РЭЖЫСЁР, ЗАСЛУЖАНЫ АРТЫСТ БССР**

**22 ЖНІЎНЯ 1911 Г. – 9 ВЕРАСНЯ 1986 Г.**

# ЛАКШТАНАВА ІЛЬЗА КАНСТАНЦІНАЎНА

**АКТРЫСА, ЗАСЛУЖАНАЯ АРТЫСТКА БССР**

**НАР. 31 СТУДЗЕНЯ 1923 Г.**

**ФОНД № 355**

**ВОПІС № 1**

**1952 – 1983**

МІНСК 2017

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 355**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ І.П. ЛАКШТАНАВА | 1-24 | 1-4 |
| 1.1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ І.П. ЛАКШТАНАВА | 1-24 | 1-4 |
| 1.1.1. | ФАТАГРАФІІ І.П. ЛАКШТАНАВА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ ДЗЯРЖАЎНАГА РУСКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА БССР ІМЯ М. ГОРКАГА | 1-5 | 1 |
| 1.1.2. | РУКАПІСЫ І.П. ЛАКШТАНАВА | 6-19 | 1-3 |
| 1.1.3. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ І.П. ЛАКШТАНАВА | 20-24 | 3-4 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ І.К. ЛАКШТАНАВАЙ | 25-33 | 4-5 |

## Прадмова

**Іосіф (Іёна) Пятровіч Лакштанаў** нарадзіўся 22 жніўня 1911 года ў г.Сумах УССР. З 1930 г. да 1936 г. вучыўся ў Кіеўскім будаўнічым інстытуце. У 1936 г. скончыў драматычную студыю Кіеўскага дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра (цяпер – Нацыянальны акадэмічны тэатр рускай драмы імя Лесі Украінкі), у 1939 г. – студыю Дзяржаўнага опернага тэатра імя народнага артыста Рэспублікі К.С. Станіслаўскага (цяпер – Маскоўскі акадэмічны музычны тэатр імя народных артыстаў СССР К.С. Станіслаўскага і У.І. Неміровіча-Данчанкі). У 1941–1942 гг. знаходзіўся ў Чырвонай Арміі. Працаваў у тэатрах г. Саратава, г. Масквы, г. Таганрога, з 1952 г. – у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага (цяпер – Нацыянальны акадэмічны рускі драматычны тэатр імя М. Горкага). З 1960 г. працаваў рэжысёрам, з 1980 г. да 1985 г. – артыстам Беларускай дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармоніі.

Вядомыя акцёрскія работы ў Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага: Люсиндо (“Хитроумная влюблённая” Лопэ дэ Вега, дэбют) (1952), Король Французский (“Король Лир” У. Шэкспіра) (1953), Николай II (“Главная ставка” К.Л. Губарэвіча) (1957), Мика Ставинский (“Барабанщица” А.Д. Салынскага) (1959), Пинчук (“Брестская крепость” К.Л.Губарэвіча), Первый офицер (“Оптимистическая трагедия” У.В. Вішнеўскага) [1950-я гг.], рэжысёрскія: “Не называя фамилий” В.П. Мінко і “Весна в Москве” В.М. Гусева (1953), “Повторный визит” С. Дубравіна (1957), “Далёкая дорога” А.М. Арбузава (1958). Найбольш значныя пастаноўкі ў Белдзяржфілармоніі: канцэрт да 50-годдзя БССР у Палацы з’ездаў і на ВДНГ СССР, літаратурна-музычны канцэрт “Мама и нейтронная бомба”. Аўтар ненадрукаваных п’ес “Зодчие”, “Сентябрьское утро”, сцэнарыяў канцэртаў і літаратурна-музычных кампазіцый, фельетонаў, маналогаў, вершаў, тэкстаў песень і інш.

У 1970 г. І.П. Лакштанаву было прысвоена званне “Заслужаны артыст БССР”.

І.П. Лакштанаў памёр 9 верасня 1986 г.

**Ільза Канстанцінаўна Лакштанава** (да шлюбу – Шульмейстар) нарадзілася 31 студзеня 1923 г. у г. Камышыне Данской (цяпер – Валгаградскай) вобласці. У 1940 г. скончыла школу ў г. Саратаве, у 1944 г. – курс М.М. Тарханава і У.В. Белакурава ў Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва імя А.В. Луначарскага ў г. Маскве (цяпер – Расійскі ўніверсітэт тэатральнага мастацтва (ГИТИС). З 1944 г. да 1952 г. па размеркаванні працавала ў Таганрогскім драматычным тэатры імя А.П. Чэхава. У 1952 г. Камітэтам па справах мастацтваў пры Савеце міністраў СССР была пераведзена ў Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР, дзе да 1990 г. сыграла звыш 70 роляў. Найбольш вядомыя з іх ролі: Фенисы (“Хитроумная влюблённая” Лопе дэ Вега) (1952), Корделии (“Король Лир” У. Шэкспіра) (1953), Илоны Алгрен (“Каменное гнездо” Х. Вуаліёкі) (1956), Зарины

(“Брестская крепость” К.Л. Губарэвіча) (1959), Клавдии (“Дети Ванюшина” С.А. Найдзёнава) [1950-я гг.], Королевы Елизаветы (“Марии Стюарт” Ф. Шылера) (1969), Розы Александровны (“Ретро” А.М. Галіна) (1980).

У 1954 г. І.К. Лакштанавай было прысвоена званне “Заслужаная артыстка БССР”. У 1955 г. была ўзнагароджана ордэнам “Знак Пашаны”, у 1970 г. – медалём “100 год з дня нараджэння У.І. Леніна”.

У 1991 г. І.К. Лакштанава эмігрыравала ў Ізраіль.

Дакументы сямейнага архіва І.П. і І.К. Лакштанавых паступілі ў аддзел фарміравання НАФ БДАМЛМ 3 верасня 1991 г. ад Ільзы Канстанцінаўны Лакштанавай. У 1991 г. яны прайшлі экспертызу гістарычнай і навуковай каштоўнасці і ў адпаведнасці з рашэннем ЭМК БДАМЛМ (пратакол № 11 ад 24.12.1991 г.) былі прыняты на пастаяннае захоўванне. У 2017 г. дакументы сямейнага архіва І.П. і І.К. Лакштанавых прайшлі навуковае апісанне. Быў складзены вопіс № 1 у колькасці 33 спраў (70 дакументаў) за 1952–1983 гг.

Вопіс складаецца з 2-х раздзелаў.

1. У раздзеле “Дакументы І.П. Лакштанава” – 3 падраздзелы, справы ў якіх сістэматызаваны па жанрах і храналогіі за 1953–1983 гг. У першым падраздзеле змешчаны фатаграфіі І.П. Лакштанава ў ролях і сцэнах з спектакляў “Брестская крепость”, “Король Лир”, “Порт-Артур” і інш. Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага. Другі падраздзел прадстаўлены рукапісамі І.П. Лакштанава: п’есамі, інтэрмедыяй, сцэнарыямі для лялечнага тэатра, літаратурнага канцэрта і інш., фельетонамі, маналогамі, вершамі, тэкстамі песень і інш. Трэці падраздзел – дакументы да біяграфіі І.П. Лакштанава прадстаўлены ганаровымі граматамі і падзякай.

За падраздзелам змешчаны: рэцэнзія на спектакль па п’есе І.П. Лакштанава (паводле аповесці А.П. Чэхава) “Ненужная победа” (1960) і фотапартрэт І.П.Лакштанава [пач. 1980-х гг.].

2. У раздзеле “Дакументы І.К. Лакштанавай” знаходзяцца яе фатаграфіі ў ролях і сцэнах з спектакляў “Барабанщица”, “Варвары”, “Её друзья”, “Король Лир”, “Мария Стюарт”, “Путешественник без багажа” і інш. Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага.

За падраздзелам змешчаны: праграма спектакля “Антоний и Клеопатра” У. Шэкспіра з удзелам І.К. Лакштанавай (1964) і фотапартрэт І.К. Лакштанавай за [1950-я гг.].

Прадмову склала
вяд. архівіст В.Ф. Шаталава

17.07.2017

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

______________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ І.П. ЛАКШТАНАВА** | | | | |
| | **1.1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ І.П. ЛАКШТАНАВА** | | | | |
| | **1.1.1. ФАТАГРАФІІ І.П. ЛАКШТАНАВА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ ДЗЯРЖАЎНАГА РУСКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА БССР ІМЯ М. ГОРКАГА** | | | | |
| 1 | Фатаграфіі І.П. Лакштанава ў ролі Короля Французского ў спектаклі "Король Лир" па п'есе У. Шэкспіра | 1953 | 5 | 3 | |
| 2 | Фатаграфіі І.П. Лакштанава ў ролі Сахарова ("Порт-Артур" І.Ф. Папова і А.М. Сцяпанава, рэж. В.Ф. Фёдараў) і сцэны з гэтага спектакля з удзелам І.П. Лакштанава і М.В. Сокала (у ролі Барона Танаки) | 1954 | 3 | 2 | |
| 3 | Фатаграфіі І.П. Лакштанава ў ролі Пинчука ("Брестская крепость" К.Л. Губарэвіча) і неўстаноўленай ролі | [1954, 1950-я гг.] | 2 | 2 | |
| 4 | Фатаграфія сцэны з неўстаноўленага спектакля з удзелам Я.А. Карнавухава і І.П. Лакштанава | [1950-я гг.] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 5 | Фатаграфія сцэны з спектакля "Ненужная победа", пастаўленага рэж. Б.Н. Дакутовічам па п'есе І.П. Лакштанава паводле аповесці А.П. Чэхава з удзелам Я.А. Карнавухава (у ролі Артура фон Зейница) і І.К. Лакштанавай (у ролі Ильки) | 1960 | 1 | 1 | |
| | **1.1.2. РУКАПІСЫ І.П. ЛАКШТАНАВА** | | | | |
| 6 | "Зодчие". П'еса ў 3-х дзеях. Машынапіс з аўтарскай праўкай у пераплёце | [1950-я-1960-я гг.] | 70 | 1 | |
| 7 | "Сентябрьское утро". П'еса. Машынапіс | [1950-я-1960-я гг.] | 95 | 1 | |
| 8 | "Гибель Туманова царства". П'еса-казка для тэатра лялек. "Два интервью (сцены с магнитофоном)". Інтэрмедыя. | [1961, 1970-я-1980-я гг.] | 42 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Машынапіс з аўтарскай карэктурай, машынапіс | | | | |
| | * * * | | | | |
| 9 | "Педагогическая поэма". Кампазіцыя ў 2-х частках паводле аднайменнага твора А.С. Макаранкі. Машынапіс з аўтарскай праўкай і ўстаўкай | [1950-я-1960-я гг.] | 54 | 1 | |
| 10 | "Ненужная победа". Драма ў 3-х дзеях. Інсцэніроўка паводле аповесці А.П. Чэхава. Машынапіс з аўтарскай праўкай і ўстаўкамі ў пераплёце | [1960] | 66 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 11 | "Забавные минутки, куклы, песни и шутки". Сцэнарый лялечнага прадстаўлення-канцэрта для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Машынапіс | [1960-я-1970-я гг.] | 15 | 1 | |
| 12 | "Мы защищаем любовь". Сцэнарый для агітацыйнага калектыва. Машынапіс з аўтарскай праўкай | [1960-я-1970-я гг.] | 18 | 1 | |
| 13 | "Не просто женщине живётся". Сцэнарый літаратурнага канцэрта. "Я знаю!". Літаратурна-музычная кампазіцыя да 60-годдзя заснавання СССР. Машынапіс з аўтарскай праўкай | [1970-я- пач. 1980-х гг.],1983 | 36 | 2 | |
| 14 | "Один из самых великих (Людвиг ван Бетховен)". Сцэнарый канцэрта-спектакля. Варыянты. Машынапіс з аўтарскай праўкай | [пач. 1980-х гг.] | 46 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 15 | "Наболевшее", "Щедрость". Фельетоны. Аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс з аўтарскай праўкай | [1960-я-1970-я гг.] | 9 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 16 | "Редкая профессия", "Ты помнишь, товарищ?", "Я протестую" і інш. Маналогі. Аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | 1960, [1960-я-1970-я гг.] | 10 | 5 | |
| 17 | "Без тебя", "Слово о боевом братстве", "Цыганские кибитки" і інш. Вершы. Машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | [1960-я-1970-я гг.] | 8 | 5 | |
| 18 | "Вступительная песня к программе "От чистого | [1960-я-1970-я гг.] | 14 | 11 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | сердца", "Мандолината", "Песенка о первом поцелуе" і інш. Тэксты песень, рэпрыза да антракту.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | | | | |
| | * * * | | | | |
| 19 | У.У. Алоўнікаў. "Вечерняя прогулка". Песня для мужчынскага хору з фартэпіяна.<br>Словы І.П. Лакштанава.<br>Рукапіс перапісчыка | [1960-я-1970-я гг.] | 4 | 2 | |
| | **1.1.3. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ І.П. ЛАКШТАНАВА** | | | | |
| 20 | Ганаровыя граматы Міністэрства культуры БССР, Міністэрства культуры СССР, ЦК ЛКСМ БССР і інш. на імя І.П. Лакштанава за плённую працу і ў сувязі з юбілейнымі дзяржаўнымі датамі | 1967-1972 | 12 | 7 | |
| 21 | Ганаровая грамата прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР на прысваенне звання заслужанага артыста БССР на імя І.П. Лакштанава | 1970 | 2 | 1 | |
| 22 | Ганаровая грамата і падзяка дырэкцыі Белдзяржфілармоніі, Міністэрства культуры БССР, БРК прафсаюза работнікаў культуры і інш. на імя І.П. Лакштанава ў сувязі з 60-годдзем з дня яго нараджэння | 1971 | 6 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 23 | Д.Р. Сімановіч. "Ілька". Рэцэнзія на спектакль Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Ненужная победа" па п'есе І.П. Лакштанава паводле аповесці А.П. Чэхава.<br>Выразка з газеты | 1960 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 24 | Фотапартрэт І.П. Лакштанава.<br>Наклеены на ДВП | [пач. 1980-х гг.] | 1 | 1 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ І.К. ЛАКШТАНАВАЙ** | | | | |
| 25 | Фатаграфія сцэны з спектакля "Её друзья" Дзярж. рускага драматычнага тэатра БССР, пастаўленага рэж. А. Нікіціным па п'есе В.С. Розава, з удзелам І.К. Лакштанавай і інш. акцёраў у неўстаноўленых ролях | 1952 | 1 | 1 | |
| 26 | Фотапартрэты І.К. Лакштанавай у ролях Анны | [1952, 1969] | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | ("Варвары" М. Горкага) і Королевы Елизаветы ("Мария Стюарт" Ф. Шылера), сыграных у Дзярж. рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага | | | | |
| 27 | Фатаграфія сцэны з спектакля Дзярж. рускага драматычнага тэатра БССР "Король Лир", пастаўленага рэж. В.Ф. Фёдаравым па п'есе У. Шэкспіра, з удзелам І.К. Лакштанавай (у ролі Корделии) і інш. акцёраў | [1953] | 1 | 1 | |
| 28 | Фатаграфія сцэны з спектакля Дзярж. рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага "Барабанщица", пастаўленага рэж. М.Л. Співаком па п'есе А.Д. Салынскага, з удзелам [М.І. Кузьменкі] (у ролі Марии Игнатьевны), І.К. Лакштанавай (у ролі Нины Снижко) | [1959] | 1 | 1 | |
| 29 | Фатаграфія сцэны з спектакля Дзярж. рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага "Океан", пастаўленага рэж. М.Л. Співаком па аповесці А.П. Штэйна, з удзелам Я.А. Карнавухава (у ролі Платона), І.К. Лакштанавай (у ролі Маши) | [1961] | 1 | 1 | |
| 30 | Фатаграфіі сцэн з неўстаноўленага спектакля Дзярж. рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага з удзелам Я.А. Карнавухава, М.І. Кузьменкі, І.К. Лакштанавай у неўстаноўленых ролях | [пач. 1960-х гг.] | 2 | 2 | |
| 31 | Фатаграфія сцэны з спектакля Дзярж. рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага "Путешественник без багажа", пастаўленага рэж. А.А. Даброцінымпа п'есе Ж. Ануя, з удзелам І.М. Камарова (у ролі Гастона), І.К. Лакштанавай (у ролі Валентины Рено) | [1969] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 32 | Праграма спектакля "Антоний и Клеопатра" У. Шэкспіра (рэж. В.П. Рэдліх) Дзярж. рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага з удзелам І.К. Лакштанавай | 1964 | 2 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 33 | Фотапартрэт І.К. Лакштанавай | [1950-я гг.] | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 33 (трыццаць тры)

спраў з № 1 па № 33 , 70 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

вяд. архівіст В.Ф. Шаталава

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.